# FORMUŁA ŚLUBÓW ZAKONNYCH :



*(...) Ja, mając mocną wolę doskonałego zachowania Ewangelii (...)*

*ślubuję żyć (...) w POSŁUSZEŃSTWIE (...)*

*według Reguły (...) oraz Konstytucji (...)*



*Całym sercem powierzam się rodzinie zakonnej sióstr bernardynek*

## Рэгула св. Клары Асізскай:



*Настаяцельніца няхай настаўляе і наведвае сваіх сясцёр, а таксама пакорліва і з любоўю схіляе іх да выпраўлення. І няхай не дае ім даручэнняў, якія б  супярэчылі іх душы (сумленню) і нашым абетам.*



*А сёстры, якія знаходзяцца пад яе ўладаю, няхай памятаюць, што дзеля Бога яны адракліся ўласнай волі. Таму яны маюць строгі абавязак слухацца сваіх настаяцельніц ува ўсім, што паабяцалі Пану захоўваць, а што не супярэчыць іх душы (сумленню) і нашым абетам.*

**Папа св. Ян Павел ІІ**



**“Vita consecrata”, энцыкліка аб кансэкраваным жыцці:**



*Хто ж не заўважае шматлікай несправядлівасці, а нават насілля, якія ў жыцці паасобных людзей і народаў з'яўляюцца наступствам ЗЛОЎЖЫВАННЯ СВАБОДАЮ.*

*Прароцкая місія кансэкраванага жыцця (...) “Правакацыя”*

*таямніца чалавечай свабоды як шляху паслушэнства воле Айца*

*і таямніца паслушэнства як шляху паступовага здабывання сапраўднай свабоды*



*Аб гэтай, менавіта, таямніцы кансэкраваная асоба прагне сведчыць, калі складае гэты канкрэтны абет*

[ т а я м н і ц а ]

Святая Тэрэза
ад Дзіцятка Езус

Доктар Касцёла
і апякунка місій



**Папа св. Ян Павел ІІ**





**“Vita consecrata”, энцыкліка аб кансэкраваным жыцці:**

*Той, хто выконвае ўладу, не можа адрачыся сваёй функцыі таго, хто, як першы, узначальвае супольнасць (...) Трэба пацвердзіць значэнне гэтага задання, якое неабходна як раз каб узмоцніць братэрскую камунію і каб не ўдарэмніць абет паслушэнства (...)*

*Улада павінна мець характар, перадусім, братэрскі і духоўны (...) Тыя, хто выконвае ўладу, павінны весці дыялог з сёстрамі ў працэсе прыняцця рашэння (...)*



*Варта, аднак, прыгадаць, што да ўлады належыць апошняе слова, і яна мае заданне задбаць аб выкананні прынятых рашэнняў.*

*(...) Паслушэнства, якое ажыўляецца любоўю (...)*

**Св. Францішак Асізскі**

**Настаўленне 3 “Аб дасканалым паслушэнстве”:**



*Пан кажа ў Евангеллі: «Калі хто не пакіне ўсяго, што мае, не можа быць Маім вучнем»; і «Хто хоча жыццё сваё ўратаваць, той загубіць яго»*

*Той чалавек пакідае ўсё, што мае, і загубляе сваё цела, які сябе самога поўнасцю аддае ў паслушэнства ў рукі свайго настаяцеля. І калі штосьці робіць ці гаворыць, ведаючы, што гэта не супрацівіцца яго [настаяцеля] волі, і робіць добрае, то гэта — **сапраўднае паслушэнства**.*

*І калі падначалены бачыць нешта лепшае і больш карыснае для свай душы, чым наказвае яму настаяцель, то няхай дабраахвотна ахвяруе гэта Богу, а тое, што кажа настаяцель імкнецца выканаць. Бо гэта — **паслушэнства з любові**, якое задавальняе Бога і бліжняга.*

*Калі ж настаяцель загадвае штосьці, што супрацівіцца з сумленнем [падначаленага], то можна яго не паслухаць, але толькі ад яго не адлучацца. І калі б з гэтай прычыны цярпеў ад кагосьці пераследванне, то няхай яго яшчэ больш любіць дзеля Бога. Бо хто хутчэй гатовы цярпець пераслед, чым аддзяліцца ад сваіх братоў, той сапраўды знаходзіцца ў **дасканалым паслушэнстве**, бо аддае жыццё сваё за братоў сваіх (...)*

*Крывадуш ... вяно са*
*свайго во ... няць*
*шчэпку з с...*



**2 Кар 9,7:**

*Радаснага даўцу любіць Бог*



**Як 5,9:**

*Не наракайце, браты, адзін на аднаго, каб не быць асуджанымі*

**Інструкцыя Кангрэгацыі д.с. каесэкраванага жыцця аб жэнскім кантэмпляцыйным жыцці (у разд. пра фармаванне):**



*(...) выражанне ў кожным моманце жыцця поўнай і радаснай прыналежнасці да Хрыста.*